# ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАЕ НАВУЧАННЕ СТУДЭНТАЎ ЯК ПРЫЯРЫТЭТНЫ ПАДЫХОД ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ ПА ПАДРЫХТОЎКІ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ «МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ»

***Лупашка І.Г.,*** *старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства, кандыдат культуралогіі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Не выклікае сумненняў, што ў сучасных умовах узрастае значэнне выкарыстання практыка-арыентаваных тэхналогій. Пра гэта сведчыць і інструкцыйна-метадычны ліст «Об организации образовательного процесса в учреждениях высшего образования в 2017/2018 учебном году», дзе ў якасці асноўных задач на 2016 – 2020 гг. вызначаны наступныя: павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, эфектыўнасці практыка-арыентаванай падрыхтоўкі і паглыбленне сувязяў з арганізацыямі-заказчыкамі кадраў;павышэнне канкурэнтназдольнасці вышэйшай адукацыі ў сусветнай адукацыйнай прасторы; удасканаленне сістэмы планавання і аптымізацыя структуры падрыхтоўкі кадраў з вышэйшай адукацыяй [1].

На наш погляд, практыка-арыентаванае навучанне студэнтаў засноўваецца на наступных складніках: практыка-арыентаваны падыход пры выкладанні вучэбных дысцыплін, арганізацыя практыкі на вытворчых профільных базах, майстар-класы спецыялістаў як на базе ўніверсітэта, так і па-за яго межамі.

На думку першага намесніка міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь В. Богуша, пераважная роля ў падрыхтоўцы прафесійных кадраў належыць менавіта арганізацыі практыкі ва ўстановах адукацыі: «Насколько эффективно в учреждениях образования будет организована практика – основной механизм формирования у учащихся практических профессиональных компетенций, настолько качественно мы повысим уровень подготовки специалистов» [3].

Больш падрабязна разгледзім арганізацыю практыкі па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» як значны кампанент вучэбнага працэсаі адзін з найважнейшых складнікаў атрымання студэнтамі прафесійных кампетэнцый.

Пры навучанні студэнтаў па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» (па напрамках «музеязнаўства» і «культурная спадчына і турызм») выкарыстоўваецца традыцыйная, добра зарэкамендаваўшая сябе схема пабудовы практык – ад вучэбных да вытворчых. Кожная

практыка, у залежнасці ад віду, мае свае асобныя мэты, задачы і вынікі.

Вучэбныя практыкі запланаваны на I і II курсах, з'яўляюцца агульнымі для абодвух напрамкаў спецыяльнасціі носяць пераважна азнаямленчы характар. Да іх адносяцца археолага-этнаграфічная (I курс) і музейная (азнаямленчая, IIкурс) практыкі.

Вучэбную археолага-этнаграфічную практыку студэнты праходзяць у арганізацыях, адпавядаючых профілю падрыхтоўкі спецыялістаў і маючых матэрыяльную базу для правядзення дадзенай практыкі. Базавай установай для правядзення гэтага віда практыкі з'яўляецца Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Задачамі вучэбнай археолага-этнаграфічнай практыкі з'яўляюцца: замацаванне тэарэтычных ведаў студэнтаў, атрыманых па курсе «Археалогія» і «Этналогія і этнаграфія Беларусі»; набыццё першасных практычных навыкаў правядзення археалагічных і этнаграфічных даследаванняў у палявых умовах; азнаямленне з дакументацыяй, складаемай у працэсе правядзення археалагічных і этнаграфічных даследаванняў; азнаямленне з музейнымі экспазіцыямі, якія ўтрымліваюць археалагічныя і этнаграфічныя экспанаты [2].

Вучэбная музейная (азнаямленчая)практыка накіравана на знаёмства студэнтаў з музеямі краіны розных профіляў. Згодна з вучэбным планам практыка праводзіцца без адрыву ад адукацыйнага працэсуў форме экскурсій па вызначаных кіраўніком практыкі музейных установах. У якасці яшчэ аднаго напрамку гэтага віда практыкі можна вылучыць выязную азнаямленчую практыку. Студэнты і выкладчыкі пабывалі ў розных куточках Беларусі: Мір, Нясвіж, Брэст, Гродна, Гомель, Магілёў і інш.

Гэты від практыкі праводзіцца перад пачаткам вывучэння студэнтамі шэрагу музеязнаўчых курсаў, што закладае аснову ў далейшым працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў-музеязнаўцаў. У ходзе практыкі адбываецца азнаямленне студэнтаў: з музейнай сеткай краіны; з музеямі розных профіляў і тыпаў; са структурнай пабудовай музейнай установы; з асноўнымі кірункамі дзейнасці музеяў; з экспазіцыямі вядучых музейных устаноў краіны; з сегментацыяй наведвальнікаў музеяў па розных прыкметах і інш.

Такім чынам, пры праходжанні студэнтамі вышэйразгледжанных відаў вучэбнай практыкі адбываецца замацаванне ведаў па праслуханых вучэбных дысціплінах; падрыхтоўка студэнтаў да паглыбленага практычнага вывучэння спецыяльных вучэбных дысцыплін; набыццё студэнтамі першасных практычных навыкаў і ўменняў па абранай спецыяльнасці.

Вытворчая практыка ўключае практыку па напрамку спецыяльнасці і пераддыпломную.

На III курсе праграмай прадугледжваецца вытворчая экскурсійная практыка. Вытворчая экскурсійная практыка непасрэдна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звязана з тэарэтычнымі курсамі па музеязнаўчых і турыстычных дысцыплінах, у першую чаргу з курсамі «Тэорыя і практыка экскурсійнай работы» і «Музейная педагогіка». Студэнты атрымліваюць магчымасць спалучыць свае тэарэтычныя веды з практыкай музейнай дзейнасці.

Студэнты праходзяць практыку на базе вядучых музеяў і турыстычных устаноў краіны. Пастаянныя партнёрскія адносіны ўсталяваліся з такімі музеямі як Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь (і яго філіялы), Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Музей гісторыі горада Мінска (і яго філіялы) і інш. музейнымі і турыстычнымі ўстановамі.

Мэтамі вытворчай экскурсійнай практыкі з’яўляюцца удасканаленне тэарэтычных ведаў па музеязнаўчых прадметах, атрыманне практычных навыкаў па аднаму з асноўных напрамкаў музейнай і турыстычнай дзейнасці, авалоданне навыкамі экскурсійнай работы, фарміраванне ў студэнтаў навыкаў у галіне асветніцка-выхаваўчай дзейнасці музеяў, методыкі і практыкі экскурсійнага абслугоўвання насельніцтва [2].

Вытворчая экскурсійная практыка непасрэдна далучае студэнтаў-практыкантаў да правядзення экскурсій, дае магчымасць набыць навыкі самастойнай распрацоўкі і правядзення аглядных і тэматычных экскурсій.

На 4 курсе вытвворчая практыка прадугледжвае размеркаванне згодна з напрамкам спецыяльнасці: музейная фондавая (для напрамка «музеязнаўства») ці менеджарская (для напрамка «культурная спадчына і турызм»).

Мэтамі музейнай фондавай практыкі з’яўляюцца атрыманне практычных навыкаў у галіне камплектавання, вывучэння і захавання фондавых калекцый музеяў, азнаямлення з асноўнымі сістэмамі ўліку прадметаў музейных калекцый. Вытворчая музейная фондавая практыка накіравана на паглыбленне, пашырэнне і замацаванне тэарэтычных ведаў і набыццё студэнтамі прафесійных навыкаў і ўменняў па навукова-фондавай рабоце музеяў.

Падчас вытворчай менеджарскай практыкі студэнты знаёмяцца з сучасным станам турыстычнай дзейнасці ў краіне. Практыка спрыяе выпрацоўцы творчага даследчыцкага падыходу да работы ў галіне турызму, набыццю імі навыкаў аналізу вынікаў сваёй працы і садзейнічае засваенню навыкаў менеджарскай дзейнасці студэнтаў у канкрэтнай турыстычнай арганізацыі.

Мэтамі вытворчай менеджарскай практыкі з’яўляюцца атрыманне практычных навыкаў у галіне асаблівасцей арганізацыі тураў (аўтобусных, авіятураў, чыгуначных турыстычных маршрутаў, групавых, індывідуальных), азнаямленне з еўрапейскімі правіламі і нормамі забеспячэння бяспекі турыстаў, набыццё практычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навыкаў у складанні дамоў дзеля ўдзельнікаў тураў. Гэты від практыкі накіраваны на паглыбленне, пашырэнне і замацаванне тэарэтычных ведаў і набыццё студэнтамі прафесійных навыкаў і ўменняў па правядзенні сегментацыі рынку для прыцягвання кліентаў [2].

Такім чынам, падчас вытворчай практыкі адбываецца непасрэдная падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай работы.

Мэтамі пераддыпломнай практыкі з'яўляюцца: паглыбленне, пашырэнне, сістэматызацыя і замацаванне тэарэтычных ведаў, уменняў і навыкаў навукова-даследчай работы, атрыманых у працэсе навучання па спецыяльнасці, непасрэдная практычная падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай даследчай работы, напісанне дыпломнай работы.

У задачы практыкі ўваходзіць правядзенне пошукаў крыніц і літаратуры па тэме дыпломнай работы, збор і апрацоўка крыніц дыпломнага даследавання, напісанне гістарыяграфічнага агляду літаратуры па тэме дыпломнага даследавання, вывучэнне і авалоданне метадамі гістарычнага даследавання.

Падсумоўваючы вышэйсказанае адзначым, што вучэбная і вытворчая практыка студэнтаў спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» з'яўляецца абавязковай часткай адукацыйнага працэсу падрыхтоўкі спецыяліста і прадугледжвае цесную сувязь тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў будучых музейных супрацоўнікаў. Усе віды практыкі ўзаемазвязаны ў адзіны працэс набыцця студэнтамі практычных ведаў у галіне падрыхтоўкі будучых музейных супрацоўнікаў і спецыялістаў па культурным турызме.

1. Инструктивно-методическое письмо руководителям учреждений высшего образования «Об организации образовательного процесса в учреждениях высшего образования в 2017/2018 учебном году» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://test.edu.bsu.by/page-22321. – Дата доступа: 20.01.2018.

2. Праграма вучэбнай і вытворчай практыкі : па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, напрамкаў спецыяльнасці 1-23 01 12-03 Музеязнаўства, 1-23 01 12-04 Культурная спадчына і турызм / [склад.: І. І. Бамбешка, І. Н. Колабава, А. М. Нароўская, А. А. Трусаў]. - Мінск : БДУКМ, 2016. - 22 с.

3. Практико-ориентированное обучение в учреждениях образования // Министерство образования Республики Беларусь. 2011 – 2018. - [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://edu.gov.by/news/praktikoorientirovannoe-obuchenie-v-uchrezhdeniyakh-obrazovaniya/. – Дата доступа: 18.01.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ